Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (121), 2020

*УДК 221.2-9(470)*

# Берасцейская царкоўная ўнія і раскол у «Грэка-рускай царкве» Рэчы Паспалітай

С.А. Чаропка

У прадстаўленым артыкуле даследуецца пытанне аб выніках Берасцейскага царкоўнага сабору 1596 г. Праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай, на якім разглядалася пытанне аб заключэнні царкоўнай уніі Кіеўскай мітраполіі з Рымска-Каталіцкай царквой. Аўтар прыходзіць да высновы, што вынікам сабора стала не ўтварэнне новай рэлігійнай арганізацыі – Уніяцкай царквы, а раскол у Праваслаўнай царкве Вялікага княства Літоўскага і Польшчы. Вынікам гэтага расколу стала фарміраванне дзвюх асобных цэркваў, аднолькава прэтэндуючых на спадчыну Кіеўскай мітраполіі.
**Ключавыя словы:** гісторыя хрысціянства, канфесійная гісторыя, гісторыя Беларусі, Берасцейская царкоўная ўнія, Грэка-руская царква, Беларуская Праваслаўная царква, Уніяцкая царква, Беларуская Грэка-Каталіцкая царква, Рыма-каталіцкая царква.

The results of the Brest ecclesiastical Council of 1596 of Orthodox Church of the Polish-Lithuanian Commonwealth, which considered the issue of concluding the ecclesiastical Union of the Kiev metropolis with the Roman Catholic Church, are examined. The author concludes that the result of the Council was not the formation of a new religious organization – Greek Catholic Church, but a split in the Orthodox Church of the Grand Duchy of Lithuania and Poland. The result of this split was the formation of two separate churches, equally claiming the heritage of the Kiev metropolis.
**Keywords:** history of Christianity, confessional history, history of Belarus, Brest Church Union, Greek-Russian Church, Belarusian Orthodox Church, Uniate Church, Belarusian Greek Catholic Church, Roman Catholic Church.

Гісторыя Беларусі вельмі багатая на разнастайныя падзеі, якія да сённяшняга дня выклікаюць не толькі цікавасць у шырокіх колах грамадства, але і з'яўляюцца прадметамі спрэчак сярод навукоўцаў або зацікаўленых бакоў. Гэта не выпадкова, таму што беларускія землі, знаходзячыся на мяжы дзвюх магутных цывілізацыйных цэнтраў – паміж заходнееўрапейскай каталіцка-пратэстанцкай Еўропай і праваслаўнай Рускай дзяржавай – сталі аб'ектам пранікнення элементаў розных культур. Рэлігійны светапогляд, які ў ранні новы час панаваў у грамадстве, прадвызначаў цеснае ўзаемадзеянне розных элементаў духоўнага і паўсядзённага жыцця чалавека з пэўнай рэлігійнай, а больш канкрэтна – царкоўнай традыцыяй. Менавіта царква адыгрывала ролю аксіялагічнага прадуцэнта і каштоўнаснага арыенціра, захавальніка традыцый, а таксама маркера прыналежнасці да канкрэтнай этнічнай групы. Невыпадкова таму, пранікненне элементаў чужой культуры, якія супярэчылі ці не цалкам адпавядалі традыцыйным аналагам, выклікала часта вострую рэакцыю менавіта з боку галоўнага захавальніка традыцыі – царквы.

Вестэрнізацыя «рускага» грамадства Літвы, якая была цесна звязана з палітычным збліжэннем Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (ВКЛ) і Польшчы, выклікала, паміж іншым, канфлікт паміж традыцыйнай для мясцовага насельніцтва Праваслаўнай царквой і паўстаўшым тут у канцы XIV ст. Каталіцкім касцёлам. Таму невыпадкова, што адной з найбольш істотных праблем як ва ўнутраным жыцці ВКЛ з'яўлялася пытанне міжканфесіянальных адносін. Падтрымка кіраўніцтвам Рэчы Паспалітай Каталіцкага касцёла, а таксама распаўсюджванне ідэй Рэфармацыі нанеслі ўдар па Праваслаўнай царкве. Кіеўская мітраполія ў канцы XVI ст. апынулася ў вельмі няпростым становішчы. На думку яе кіраўніцтва, адным з варыянтаў паляпшэння становішча царквы магла стаць унія з Рымам. Ідэя аднаўлення адзінства хрысціянства лунала ў заходнім і візантыйскім грамадстве адразу ж пасля расколу хрысціянскай царквы ў 1054 г. У 1274 г. была заключана Ліёнская царкоўная ўнія, у 1439 г. – Фларэнцыйская ўнія, якія, хаця і былі падтрыманы часткаю праваслаўных архірэяў, у сувязі з рознымі абставінамі доўга не праіснавалі. Аднак ва ўмовах распаўсюджвання ў ВКЛ культуры эпохі Адраджэння, ідэі якой пранiклі і ў «рускае» грамадства, сярод часткі ўсходнехрысціянскага кліра Рэчы Паспалітай адрадзілася ідэя заключэння ўніі. Спробы праваслаўнага епіскапата на чале з кіеўскім мітрапалітам Міхаілам Рагозам палепшыць становішча праваслаўнай царквы праз заключэнне царкоўнай уніі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хуткага выніку не далі, а, наадварот, прывялі да абвастрэння ўнутрыканфісійнай барацьбы. Праваслаўнае насельніцтва Вялікага княства Літоўскага падзялілася на два лагеры – тых, хто падтрымаў царкоўную ўнію – уніятаў, а таксама тых, хто яе рашуча адвергнуў – дызунітаў. Рэлігійная канверсія ішла побач з канверсіяй этнічнай.

У грамадскай свядомасці склалася ўстойлівае перакананне аб тым, што пасля Берасцейскай царкоўнай уніі ў Рэчы Паспалітай узнікла Уніяцкая царква, а Праваслаўная царква аказалася ў прыгнечаным становішчы. Аднак гэты тэзіс не толькі спрашчае разуменне канфесійных працэсаў у Рэчы Паспалітай, але і прыводзіць да не зусім іх карэктнага асэнсавання рэалій XVII ст. Справа ў тым, што для чалавека XXI ст. тэрміны Праваслаўная царква і Грэка-Каталіцкая (уніяцкая) царква адназначна ўспрымаюцца як асобна існуючыя рэлігійныя арганізацыі, якія прытрымліваюцца поглядаў розных канфесій хрысціянства – праваслаўя і каталіцтва адпаведна.

Аднак у свядомасці людзей XVII ст. доўгі час не існавала арганізацыі з назвай «Праваслаўная царква». Сам тэрмін праваслаўная царква насіў перш за ўсё значэнне «правільная царква», прававерная, не ерытычная, царква, якая належыць да ўсяленскага праваслаўя. Але арганізацыі з назвай «Праваслаўная царква» не было. Для сучаснікаў існавала Грэчаская, Усходняя або Руская царква, якая ў Рэчы Паспалітай узначальвалася кіеўскім мітрапалітам і супрацьпастаўлялася Рымскай, Лацінскай або Каталіцкай царкве. Прычым гэтыя тэрміны ўжываюцца ў сінанімічным значэнні як у адносінах да царквы першай, так і другой канфесіі. Менавіта аб Усходняй царкве пішуць Лаўрэнцій Зізаній, Дзям'ян Налівайка, Мялецій Сматрыцкі, Афанасій Філіповіч і многія іншыя тагачасныя антыўніяцкія публіцысты [1], [2, с. 258], [3]. Адпаведна свая канфесійная прыналежнасць антыўніяцкімі публіцыстамі вызначалася як «праваслаўе грэчаскае» [4]. У заканадаўчых актах Рэчы Паспалітай XVII ст. гэтая царква называлася пераважна Грэчаскай.

Але складанасць сітуацыі ў разуменні канфесійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай надае той факт, што тая частка насельніцтва, якая прыняла ўнію, у сваёй самасвядомасці абсалютна натуральна працягвалі заставацца ў той жа самай царкве. Іпацій Пацей, таксама як і праціўнікі ўніі, называе сваю царкву «Усходняй, Грэцкай або Рускай», царквой «закону Грэцкага ці Рускага» [5, с. 274, 277], [6]. Самога сябе ён называе пастырам «хрысціянскай праваслаўнай Рускай брацііі», а ўніяцкі клір – «духавенствам рускім» [7], [8]. Калі з багаслоўскага пункта гледжання ўсяленскага праваслаўя Кіеўская мітраполія магчыма і перастала быць праваслаўнай, то ці перастала яна быць праваслаўнай для саміх прыхільнікаў уніі, якія належалі да той жа Грэка-Рускай Усходняй царквы, наведвалі тыя ж храмы, тыя ж святары служылі тую ж літургію? Адказ на гэтае пытанне вельмі няпросты і шмат у чым залежыць ад многіх фактараў, такіх як узровень адукацыі, развіцця інтэлекту, глыбіні ўвацэркаўлёнасці чалавека. Напрыклад манахі-базыліяне Троіцкага манастыра ў Вільні 21 марта 1621 г. скардзіліся на публічную знявагу іх віленскім лаўнікам Гаспарам Лампаровічам. Знявага гэта заключалася не толькі ў тым, што іх называлі «ерацікамі» і «схізматыкамі», але і «каталікамі»! [9, с. 197]. Для часткі грамадства, якое паводле традыцыі «хадзіла ў царкву», Берасцейская ўнія знешне нічога не змяніла, а сама царква: і будынак, і арганізацыя, нікуды не знікла. Таму падтрымка або непрыняцце ўніі ў такім выпадку залежвала ад пазіцыі канкрэтнага грэка-рускага святара, які падтрымаў або асудзіў унію.

Такім чынам, з заключэннем Берасцейскай уніі, адразу ж не ўзнікла новай царкоўнай арганізацыі. Адбыўся пераход раней існаваўшай структуры Грэка-Рускай Усходняй царквы Кіеўскай мітраполіі з-пад улады Канстанцінопальскага патрыярха пад уладу Рымскіх пап. Мы не ставім перад сабой багаслоўскую задачу высвятліць ці засталася пры гэтым Грэчаская царква Кіеўскай мітраполіі праваслаўнай з кананічнага пункту гледжання, але відавочна, што для значнай часткі яе прыхільнікаў адказ на гэтае пытанне стаў вельмі прынцыповым. Адбыўся раскол унутры Грэка-Рускай Усходняй царквы Рэчы Паспалітай, яе вернікі падзяліліся на прыхільнікаў уніі (уніятаў, унітаў) і яе праціўнікаў (дызунітаў). Нягледзячы на тое, што ў гістарыяграфіі тэрмін «праваслаўныя» замацаваўся выключна за праціўнікамі ўніі, варта ўсё ж заўважыць, што і ўніяты, і дызуніты ўзніклі і некаторы час існавалі ў межах усё такі адной царкоўнай арганізацыі і аднолькава лічылі сябе праваслаўнымі – у сэнсе тымі, хто верыць і здзяйсняе ўсе абрады правільна. Заўважым, што тэрмін прававерны або ortodoxae (праваслаўны) у адносінах да сваёй царквы ўжывалі і каталікі. Для прыкладу прывядзем цытату з акта Генеральнай канфедэрацыі 1696 г. «Караля ягамосці, пана нашага сапраўднага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

католіка рымскага і каралеву каталічку, а не іншай, барані Божа, рэлігіі, абярэм, а таксама на заўсёды правы і прывілеі Праваслаўнай Рымска-Каталіцкай … Царквы …усімі сваімі сіламі трымаць будзем» [10, s. 407]. У Акце Генеральнай канфедэрацыі 1764 г. гаворыцца аб «пастановах прававернага касцёла каталіцкага Рымскага» [11, s. 7–8]. І такіх прыкладаў безліч.

Побач з працягнуўшай сваё існаванне Кіеўскай мітраполіяй Грэка-Рускай царквы аформілася паралельная нелегальная з пункту гледжання ўладаў Рэчы Паспалітай царкоўная структура з такой жа назвай. У соймавых пастановах першай трэці XVII ст. гаворка ідзе толькі аб адной царкве – Грэка-Рускай. У разуменні жыхароў Рэчы Паспалітай барацьба ішла не паміж Уніяцкай і Праваслаўнай цэрквамі, як можна зразумець гэта ў нашы дні, а ўнутры адной царквы – Грэчаскай (Рускай, Усходняй, Праваслаўнай). На пасяджэннях сойма ў 1607, 1609, 1618, 1620, 1627, 1631 гг. ставілася пытанне аб «супакаенні людзей у рэлігіі Грэцкай разрозненых», што яскрава сведчыць аб тым, што ў свядомасці тагачаснага грамадства не ўзнікла ніякай новай царквы. Толькі стварэнне ў 1620 г. апанентамі ўніі сваёй царкоўнай іерархіі і яе легалізацыя Уладзіславам IV у 1633 г. у Рэчы Паспалітай прывяло да сітуацыі, калі сталі адначасова легальна дзейнічаць дзве Грэка-Рускіх царквы. Такое становішча натуральна падштурхвала вернікаў усходняга абраду да пошуку адказу, якая з гэтых цэркваў «сапраўдная». Аднак для каталіцкага насельніцтва Рэчы Паспалітай і тая і другая царквы працягвалі належыць да «рэлігіі Грэчаскай». Нават у 1699 г., калі Кіеўская праваслаўная мітраполія ўжо знаходзілася пад уладай Маскоўскага патрыярха, на сойме ішла гаворка аб «дызунітах Грэчаскай веры» [12, с. 35].

Раскол у Грэка-Рускай царкве Кіеўскай мітраполіі, які канчаткова аформіўся ў 1633 г., нягледзячы на ўсе папярэднія і наступныя спробы яго пераадолення, прывёў да выпрацоўкі розных шляхоў эвалюцыі абодвух «рускіх» цэркваў і патрабаваў адпаведнай тэрміналогіі, якая аформілася толькі да канца XVII ст. У сувязі з гэтым звязана нявызначанасць у тэрміналогіі адносна цэркваў.

Толькі ў канцы XVII–XVIII ст. у соймавых пастановах гаворыцца аб існаванні «Праваслаўнай Рымска-Каталіцкай і абраду Грэчаскага Уніяцкага Царквы …», «Прававернага Касцёла Каталіцкага Рымскага, і з ім з’яднанага абраду Грэчаскага» [10, с. 407], [11 с. 7–8]. Прыведзеная тэрміналогія можа сведчыць аб далучэнні да уніятаў да традыцыйных структур каталіцкага касцёла і аб адсутнасці ў вернікаў усходняга абраду, якія падтрымалі ўнію, уласнай царкоўнай арганізацыі. Але гэта не так, таму што паралельна каталіцкім структурам у Рэчы Паспалітай адначасова існавалі структуры Рускай уніяцкай царквы. «Eclessia Ruthena-Unita» – менавіта гэты тэрмін ужывае настаяцель Полацкага ўніяцкага манастыра Лаўрэнцій Капарскі ў 1710 г., называючы пры гэтым праціўнікаў уніі «грэчаскія дызуніты», «Грэчаская схізматычная царква».

Для каталіцкага або «рымскага», «лацінскага» насельніцтва Рэчы Паспалітай усе прадстаўнікі візантыйскага абраду лічыліся рускімі не толькі ў этнічным, але і ў канфесійным плане. Рымскі папа Урбан VIII у лісце да ўніяцкага духавенства звяртаецца «брат Антоній Рускі мітрапаліт», «браты мітрапаліт, епіскапы і пралаты Рускія unitis» [13, с. 210]. У лісце да К. Сапегі папа таксама піша аб «рускай царкве» [14, с. 219]. Гнезенскаму каталіцкаму арцыбіскупу Урбан VIII гаворыць аб «братэрстве Рускай з Рымскай царквой» [15, с. 211].

У той жа час духавенства і вернікі, якія адверглі ўнію, працягвалі называць сваю царкву Грэчаскай, Рускай, Усходняй, усяляк падкрэсліваючы, што менавіта іх царква, з двух Грэка-Рускіх, з’ўляецца правільнай – праваслаўнай. Напрыклад Б. Хмяльніцкі ў шматлікіх універсалах, загадах, лістах называе сваю веру і царкву «Грэцкай старажытнай», «царквой Рускай», «праваслаўнай» [16, с. 46, 50, 53, 234].

Такім чынам, з расколам у праваслаўнай царкве Рэчы Паспалітай і станаўленнем дзвюх царкоўных структур, апрача іншага, ішоў працэс пошуку і выпрацоўкі адпаведнай тэрміналогіі для абазначэння структур сваёй рэлігійнай арганізацыі. Гэты працэс завяршыўся толькі да канца XVII ст., калі з’явіліся больш-менш трывалыя азначэнні Рускай уніяцкай і Грэчаскай праваслаўнай цэркваў з кіеўскімі мітрапалітамі на чале. Адзначым, што афіцыйнае замацаванне абрадавых асаблівасцей Рускай уніяцкай царквы адбылося толькі праз 124 гады пасля заключэння Берасцейскай уніі ў 1720 г. на Замойскім саборы [17, с. 101–106]. Нам падаецца, што гэты менавіта сабор у цэлым завяршыў доўгі працэс эвалюцыі свядомасці вернікаў Рускай ўніяцкай царквы ад праваслаўных ва ўніі з Рымам да каталікоў усходняга абраду. У сярэдзіне XVII ст. такога дакладнага падзелу яшчэ не было.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У гістарычных крыніцах XVII ст. няцяжка заўважыць сінанімічнасць тэрмінаў «рускі» і «праваслаўны». Прыняццё ўніі не змяніла этнічнай тоеснасці яе вернікаў, уніяты аднолькава з дызунітамі лічылі сябе, сваю веру, абрады, храмы «рускімі» [18, с. 33]. Канструкцыі «народ рускі ўсходняга паслушэнства», «праваслаўны народ рускі» маглі абазначаць не толькі праціўнікаў, але прыхільнікаў уніі [19]. Такім чынам, пасля заключэння кіраўніцтвам Кіеўскай мітраполіі Берасцейскай царкоўнай уніі з Рымам у свядомасці прыхільнікаў гэтай падзеі яны працягвалі заставацца праваслаўнымі ў канфесійным плане і рускімі – у этнічным.

Адмова ніжэйшага кліру падпарадкоўвацца рашэнню архірэяў прывялі да канфлікту ў самой Грэка-Рускай царкве, які выплеснуўся ва ўжо ўзбуджанае сацыяльна-эканамічнымі матывамі грамадства. Паміж уніятамі і дызунітамі разгарнулася жорсткая барацьба, якая перш за ўсё праявілася ў кантролі за царкоўнай маёмасцю. Спробы мітрапаліта і епіскапаў адміністрацыйнымі метадамі вярнуць пад свой кантроль храмы і манастыры, якія адмовіліся падпарадкоўвацца падтрымаўшым унію архірэям, выклікалі натуральнае незадавальненне значнай часткі дызунітаў. Гэты пратэст праявіўся ў розных формах: ад палемічнай і соймавай барацьбы, да пабояў, пагроз і нават забойства духавенства.

Вачыма ідэолагаў дызунітаў уніяцтва разглядалася як «рымская» або «ляшская» вера, адпаведна асобы, якія яе прынялі, лічыліся як «абляшыўшыяся» здраднікі сваёй веры і свайго народа [20, с. 176–177]. Пры гэтым трэба ўлічваць, што такое ўспрыманне ўніяцтва характэрна не столькі для масавай свядомасці, колькі для прапагандысцкай рыторыкі актыўных праціўнікаў уніі.

Каранацыя Уладзіслава IV змяніла становішча дызунітаў у лепшы бок. У 1633 г. новы манарх легалізаваў дызуніцкіх архірэяў, аднавіўшы легальную дзейнасць даўніяцкай Грэка-Рускай царквы. Былі падцверджаны ўсе прывілеі папярэдніх манархаў, якія былі дадзены царкве «закону Грэчаскага». Таксама былі канкрэтна вызначаны цэрквы і манастыры, якія павінны былі адысці да дызунітаў [9, с. 227, 241]. Знікненне ў 30-х гг. XVII ст. дзяржаўнай падтрымкі ўніяцкай царквы садзейнічала выхаду яе дызуніцкага канкурэнта з падпольнага становішча, што дало магчымасць дызунітам з новымі сіламі пачаць барацьбу з уніяй. Дастаткова талерантная рэлігійная палітыка Уладзіслава IV прывяла да ўзмацнення пазіцый праціўнікаў уніі і пагаршэння пазіцый яе прыхільнікаў.

Тым не менш, уніяцкая царква да сярэдзіны XVII ст. ужо мела досыць трывалыя пазіцыі ў Рэчы Паспалітай. Паводле ананімнай рэляцыі 1647 г. у Рым у Рэчы Паспалітай было каля 4 тыс. уніяцкіх і больш 13,5 тыс. дызуніцкіх прыходаў. Аб гэтым сведчыць казацкі летапісец Р. Ракушка-Раманоўскі, які паведамляе, што «… ужо не толькі ўнія ў Літве, на Валыні, але і на Украіне пачала гору браць» [21, с. 51].

Праз унію рускае грамадства Літвы адкрыла вароты да заходнееўрапейскай каталіцкай культурнай прасторы, што ў сваю чаргу выклікала не толькі насцярожанасць, але і варожасць у традыцыйна настроенай часткі рускага насельніцтва Польска-Літоўскуай федэрацыі [18, с. 16, 31]. Тым не менш, да з'яўлення казакаў у Палессі сярод «рускага» насельніцтва Літвы не сфарміравалася магутных пратэстных груп для адкрытай ўзброенай барацьбы супраць вестэрнізацыі грамадства. Палемічная дзейнасць брацтваў на рускіх землях Вялікага княства Літоўскага рэальнага плёну не дала і толькі далучэнне да брацтваў запарожскіх казакоў на Украіне зрабіла магчымым адрадзіць афіцыйную дзейнасць дызуніцкай грэка-рускай царквы ў Рэчы Паспалітай. Найбольш актыўныя прадстаўнікі рускай дызуніцкай шляхты Літвы, мяшчанства і сялянства, якія адмоўна ставіліся да распаўсюджання элементаў культурных традыцый каталіцка-пратэстанцкай Еўропы, вымушаны былі праяўляць сваю актыўнасць на Украіне, дзе такая сіла арганізавалася ў выглядзе казацтва. Такім чынам, міжканфесійны канфлікт канчаткова палітызаваўся, стаў успрымацца як этнічны канфлікт паміж «рускім» і «польскім» народамі, як канфлікт «рускага» народа з дзяржавай, улада ў якой знаходзілася ў руках «палякаў» [22, с. 156].

### Літаратура

1. Наливайко, Д. Лямент дому княжат Острозьких над зійшлим з цього світу найяснішим княжичем Олександром Костянтиновичем, княжичем Острозьким, воєводою Волинським [Электронны рэсурс] / Д. Наливайко. – Рэжым доступу : http://litopys.org.ua. – Дата доступу : 09.08.2017.

2. Зізаній, Л. Катэхізіс, або вызнанне веры святой, саборнай, апостальскай, усходняй царквы / Л. Зізаній // Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII ст.). – Мн. : Кнігазбор, 2010. – С. 258–261.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

3. Смотрицький, М. Θρηνος, тобто плач єдиної святої вселенської апостольської східної Церкви, з поясненням догматів віри спочатку з грецької мови на слов'янську, а тепер із слов'янської на польську перекладений Теофілом Ортологом, тієї самої святої Східної Церкви сином у Вільні року Божого 1610 [Электронны рэсурс] / М. Смотрицький. – Рэжым доступу : http:// http://litopys.org.ua. – Дата доступу : 09.08.2017.

4. Сматрыцкі, М. Лямент у света убогих на жалосное представление святоблівого а в обои добродетели богатого мужа, в Бозе велебного господина отца Леонтія Карповича, архімандріта общіа обители при церкви Сошествия Святого Духа, братства церковного Віленского, православія греческого / М. Сматрыцкі // Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII ст.). – Мн. : Кнігазбор, 2010. – С. 361–377.

5. Пацей, І. Справядлівае апісанне ўчынку і справы сінодавай і Абарона здзейсненых згоды і лучнасці, якія сталі на сінодзе Берасцейскім у 1596 г. / І. Пацей // Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII ст.). – Мн. : Кнігазбор, 2010. – С. 274–295.

6. Потій, І. Лист до князя Костянтина Костянтиновича Острозького від 3 червня 1598 року [Электронны рэсурс] / І. Потій. – Рэжым доступу : http://litopys.org.ua/human/hum32.htm. – Дата доступу : 09.08.2017.

7. Потій, І. Отпи́сь на ли́стъ ния́кого клирика Острозъского безъиме́нъного, кото́рый писа́лъ до влады́ки Володы́мерского и Берестейского [Электронны рэсурс] / І. Потій. – Рэжым доступу : http://litopys.org.ua/human/hum32.htm. – Дата доступу : 09.08.2017.

8. Потій, І. Унія греків з костьолом римським 1595 року. Унія або виклад попередніх артикулів, до з'єдинення Греків з костьолом римським [Электронны рэсурс] / І. Потій. – Рэжым доступу : http://litopys.org.ua. – Дата доступу : 09.08.2017.

9. Описаніе документовъ Архива западнорусскихъ униатскихъ митрополитовъ. 1470–1700. – СПб. : Сvнодальная типографія, 1897. – 503, IV с.

10. Volumina Legum. Prawa, konstytucye y przywileie Królestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od Seymu Wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego Seymu uchwalone – Petersburg : Nakladem J. Ohryzki, 1860. – T. 5. – 480 s.

11. Volumina Legum. – Petersburg : Nakladem J. Ohryzki, 1860. – T. 7.– 403 s.

12. Volumina Legum. – Petersburg : Nakladem J. Ohryzki, 1860. – T. 6.– 208, VII s.

13. Venerabilis fratribus Metropolitano, Episcopis et Prelatus Ruthenis unitis. Urbanus P.P. VIII // Historica Russiae Monumenta, ex antiquis exterarum gentium archivis et bibliothecis deprompta. – Petropoli : Typis Eduardi Pratzi, 1842. – Tomus II. – S. 210.

14. Dilecto filio nobili viro Casimiro Sapieho Marescalcho Magni Ducatis Lithuaniae Urbanus Papa VIII // Historica Russiae Monumenta, ex antiquis exterarum gentium archivis et bibliothecis deprompta. – Petropoli : Typis Eduardi Pratzi, 1842. – Tomus II. – S. 219.

15. Venerabili fratri Mathiae Archiepiscopo Gnesnensi. Urbanus P.P. VIII // Historica Russiae Monumenta, ex antiquis exterarum gentium archivis et bibliothecis deprompta. – Petropoli : Typis Eduardi Pratzi, 1842. – Tomus II. – S. 211.

16. Універсали Богдана Хмельницького. (1648–1657). – Київ : Вид. дім «Альтернативи», 1998. – 383 с.

17. Стрельбицкий, И. Униатские церковные соборы с конца XVI века до воссоединения униатов с православною церковью / И. Стрельбицкий. – Одесса : Тип. Е.И. Фесеико, 1891. – 165 с.

18. Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурнным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / С.В. Марозава ; Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т гісторыі. – Мн. : б.в., 2002. – 46 с.

19. Смотрицький, М. Протестація проти Київського собору, що був у серпні 1628 року, 8 вересня 1628 року [Электронны рэсурс] / М. Смотрицький. – Рэжым доступу : http:// http://litopys.org.ua. – Дата доступу : 09.08.2017.

20. Заборовский, Л.В. Народно-освободительная борьба украинского народа и отношения католической, униатской и православной церквей в Восточной Европе в середине XVII в. / Л.В. Заборовский, Б.Н. Флоря // Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в. : в 2 ч. – М. : Индрик, 1999. – Ч. 2. – С. 175–188.

21. Літопис Самовидця. – Київ : Наукова думка, 1971. – 207 с.

22. Флоря, Б.Н. Отражение религиозных конфликтов между противниками и приверженцами унии в «массовом сознании» простого населения Украины и Белоруссии в первой половине XVII в. / Б.Н. Флоря // Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в. : в 2. ч. – М., 1999. – Ч. 2. – С. 151–174.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 09.04.2020

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ